Філімонаў, А. Да кніг доступ адкрыты / А. Філімонаў // Віцебскі рабочы. – 1961. – 11 лют. – С. 3.

ДА КНІГ ДОСТУП АДКРЫТЫ

Адной з новых форм абслугоўвання чытачоў з'яўляецца адкрыты доступ да кніжнага фонду. Цяпер звыш двухсот бібліятэк вобласці працуюць па гэтаму метаду. З 1 студзеня пачала працаваць па-новаму і Віцебская абласная бібліятэка імя Леніна.

Арганізацыі адкрытага доступу папярэднічала падрыхтоўчая работа. Занава абсталяваны абанемент, зроблены неабходныя зручныя стэлажы. Вялікае значэнне надавалася і вывучэнню нашага фонду, бо працаваць па-новаму – значыць яшчэ лепш ведаць свае рэзервы.

Вось бібліятэка гасцінна расчыніла свае дзверы. Многія з чыггачоў былі прыемна здзіўлены. Тое, што яны ўбачылі, задаволіла іх. Перад імі адкрыўся цэлы свет кніг. Тут і разгубіцца можна. Як выбраць з такой масы патрэбную? На дапамогу прыйшоў бібліятэкар-кансультант. Не спяшаючыся, гутарыць з чытачамі загадчыца абайемента тав. Шайкевіч М. С., даведваецца аб густах, інтарэсах і раіць падысці да аднаго са стэлажоў, дзе можна знайсці карысную і цікавую кнігу. Некаторыя наведвальнікі ўжо некалькі год карыстаюцца паслугамі бібліятэкі, іх густы вядомы, і біблятэкар адразу прапануе тую ці іншую кнігу.

Шмат папрацавалі таксама работнікі абанемента тт. Янчанка, Краўцова, Маркава, Яруцкая і іншыя.

Вялікуго дапамогу ў выбары літаратуры аказваюць кніжныя выстаўкі. Іх больш пятнаццаці. Тут і «Што чытаць па філасофіі», і «Тэхніка ў сямігодцы», «Моладзі – аб камсамоле», і «Асновы навуковага атэізму», «Што чытаць хатняй гаспадыні?» і інш.

У цэнтры залы змешчан «Куток бібліяграфіі». Тут можна знайсці розныя матэрыялы, якія дапамагаюць чытачам у выбары літаратуры, расказваецца, як карыстацца сістэматычным і алфавітным каталагамі і бібліяграфічнымі ўказальнікамі літаратуры. Рэкамендуюцца такія выданні, як «Летапіс друку», «Летапіс друку БССР» і іншыя дапаможнікі.

Толькі за першыя тры дні абанемент абслужыў больш тысячы чалавек і выдаў ім звыш трох тысяч кніг па самых разнастайных галінах ведаў. Больш чым у два разы ўзрасла кнігавыдача грамадска-палітычнай літаратуры. Значна больш выдадзена літаратуры па тэхніцы, мастацтву, прыродазнаўству і іншых пытаннях.

Большасці чытачоў спадабалася новая форма работы. Аб гэтым сведчаць шматлікія водгукі. Вось што піша слесар завода металабытавых вырабаў Іван Аляксеевіч Мічурагін:

«Я ўжо даўно чытаю ў абласной бібліятэцы, але раней, прызнацца, не заўсёды быў задаволен тым, што мне прапаноўвалі бібліятэкары.

Асабліва цяжка было знайсці патрэбную тэхнічную кніжку. Прыходзілася і ў кнігасховішча схадзіць, і ў чытальную залу. А цяпер я сам вельмі проста знаходжу патрэбную мне літаратуру. Вельмі ўдзячны адміністрацыі і абслугоўваючаму персаналу за карысную справу».

Ваеннаслужачы Міхаіл Іванавіч Багачоў піша: «Як студэнт-завочнік, вельмі задаволен новай формай абслугоўвання чытачоў. Бібліятэкары робяць усё, – каб кожны з нас пайшоў дамоў з добрым настроем і цікавай кніжкай».

Як і ў кожнай новай справе, ёсць яшчэ і ў нас асобныя непаладкі. Вельмі ўскладняе справу тое, што некаторыя чытачы парушаюць правільную расстаноўку фонду. Бібліятэкары не заўсёды паспяваюць своечасова дапамагчы чытачам. Але мы прымаем неабходныя меры, каб палепшыць абслугоўванне чытачоў, як мага лепш задавальняць іх попыт.

А. ФІЛІМОНАЎ,
загадчык метадычнага аддзела